# *СМЕХАВАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ XVI-XVII стст.*

- 1 Асаблівасці смехавай культуры
- 2 “Прамова Мялешкі” – пародыя на жанр соймавых прамоў
- 3 “Ліст да Абуховіча” – як помнік парадыйна-сатырычнай літаратуры

# Асаблівасці смехавай культуры

- Парадыйная проза – тыповая з'ява пераходнага перыяду. Па сваім змесце і мове яна належыць ужо да новай традыцыі.
- Гэта ўжо не «службовае», сінкрэтычнае пісьменства сярэдне-вякоўя, а прадукт свядомай мастацкай творчасці з ярка выражанымі рысамі новага барочнага стылю:

- *гратэскнасцю,*
- *парадаксальнасцю,*
- *шматзначнасцю.*

# Асаблівасці смехавай культуры

- Шырока распаўсюджаным у гэтыя часы выступае парадыраванне кананічных жанравых форм (***казанняў, прамоў, афіцыйна-справавых лістоў*** і г.д.).
- Сатырычныя творы XVII ст. вызначаюцца сваёй ***сацыяльна-палітычнай і нацыянальна-патрыятычнай завостранасцю***.
- У літаратуры з'яўляецца карынальна ***новы тып героя і антыгероя***: усё часцей у творах усхваляецца просты, аддадзены сваё краіне і норавам продкаў чалавек і высмейваецца ганарлівы, захоплены іншаземнай культурай прадстаўнік вышэйшага саслоўя.

# Асаблівасці смехавай культуры

- Найбольш цікавымі творамі парадыйна-сатырычнай прозы з'яўляюцца творы, што ўзніклі ў праваслаўным асяроддзі:
- *"Казане руске";*
- *"Грамата, пісаная да святога Пятра".*

# "Казане руске"

- Напісана (або перапісана) ў ваколіцах Клецка каля 1697 г.
- У ім дасціпна парадзіруецца біблейскі сюжэт аб стварэнні Богам свету, першых людзей, іх грэхападзенні і выгнанні з раю.

# Казане руске"

- Усявышні нагадвае простага селяніна, які заняты штодзённымі гаспадарчымі справамі.

- *«Под небесы сотворыв птакі: вороны, сорокі, крукі, кавкі, вороб'і і цецеры. На землі сотворыв свіні, коровы, волы, медведі і вовчыска; такжэ сотворыв лісіцы, горностаі, коты, мышы і іншыя прэўцішные зверата; і побудовав ім господ рай, плотом моцным огороділ і полацю его подперл. Тамжэ насеяв дубіны, грабіны, лешчыны, ольшыны, в огородах насеяв своклы, рэпы, рэдкі, морхві, пастэрнаку і іншого хвасту і дерэва. І ходіт собе господ, глядіт, штоб якое порося не вылезло».*

# "Казане руске"

- Стваральнік першых людзей у многім прыпадабняецца прыгонніку.
- Ён забараняе Адаму і Еве есці плады з дрэва пазнання, а калі яны не паслухаліся, выганяе іх з раю дратаваным бічом.

- *«Счобы жона послушна була, счобы ся мужыка бояла. Казав жэ ім господ у раю есці свеклу, рэпу, рэдку, морков, слівкі, грушкі, яблыка і помаранчы; оно ім одного дерева заказав есці. Што ж чыніт Эва, сука незбожная, не выцерпіла собі з ліхом і заказу не слухала, штоб ей тяжкое велікое ліхо порвало; урвала яблыко, з'ела і Адамові агры(за)к дала. А Адам, не хотевшы розгневіці жонкі, з'ев. Аж прыходіт господ, лічыт яблыка, не долічывся одного; домыслілся господ, што Адам урвав; розсердівшыся, узяв біча, як у нашога пастуха, або як у панского возніцы біч дратованый, і выгнав Адама з раю».*

# "Грамата, пісаная да святога Пятра"

- У творы выкарыстаны прыёмы пародыі і гратэску
- Адрасату, «одвернему царства небесного», выказваецца просьба прапусціць у рай Ярмолу Аханцевіча Цюхая, чалавека прымітыўнага і нават агіднага.
- Пры жыцці ён *«у долгом кожуху баранём без поеса і без нагавіц ходзіл, бороды і головы нікок не часал, носа нікок не уцерал, тылько язокем лізал, нохці не обрэзывал, чоботы, чэрэвікі дзёгцем мазывал, чоснак, цыбулю, рыбу гнілую, плюсквы с подлеву, грох с недзведзем огонэм вельмі рад едал, горэлку квартою брагуковсцом духом піял, у соботу на злосць ляхом ворон, сорок і мяса пожывал...»*
- Дээстэтызацыя героя даходзіць у «пасланні» да абсурду.
- Сцверджанне, што Ярмола Аханцевіч Цюхай мае права знаходзіцца ў раі, успрымалася тагачасным чытачом як «эстэтычная правакацыя», крытыка ўсяго «нябеснага царства».

# ВЫСНОВЫ

- Творы сатырычнай прозы, парадзіруючы кананічную літаратуру, у першую чаргу Біблію, пазбаўлялі яе арэолу бездакорнасці.
- А тое, што станавілася смешным, пераставала быць непахісным і грозным.
- Парадыйная плынь у тагачаснай бел. прозе, *дэмакратычная і народная па сваім змесце і адрасе*, была скіравана супраць пануючай тады ідэалогіі Контррэфармацыі, падрушала аўтарытэт царквы, феадальнага ладу ў цэлым.

# “Прамова Мялешкі”

- Была напісана у перыяд з 1622 па 1632 гады.
- У творы ўпершыню ў старабеларускай літаратуры прагучала думка пра небяспеку канчатковай і незваротнай страты народам ВКЛ сістэмы ўласных *культурных, маральных, эстэтычных, дзяржаўных, палітычных* каштоўнасцей.

# "Прамова Мялешкі"

Адносна напісання твора даследчыкі выказваюць **2 версіі:**

- 1) невядомы аўтар выкарыстаў імя рэальнага Івана Мялешкі, мазырскага падкаморыя і кашталяна смаленскага, пасля яго смерці ў 1622 г.
- 2) гэта літаратурна апрацаваная пазней (у др. чвэрці XVII ст.) *рэальная* прамова таго Мялешкі ў сейме (1589), скіраваная супраць засілля чужаземшчыны, якое ўзмацнілася ў Рэчы Паспалітай на хвалі контррэфармацыі і ў сувязі са з'яўленнем на троне прадстаўнікоў французскай і шведскай дынастыі (*Генрыха Валуа* (1573–1574) і *Жыгімонта Вазы* (1588–1532)).

# “Прамова Мялешкі”

- “Прамова Мялешкі” з’яўляецца першым у беларускім пісьменстве **патрыятычным** творам, дзе галоўная ідэя выяўляецца **не праз факты ці лагічныя доказы**, як гэта было ў сінкрэтычнай творчасці (напрыклад, у летапісах), а **праз сістэму мастацкіх вобразаў**.

# “Прамова Мялешкі”

- Па сваёй структуры, выяўленчых сродках гэта выразна **барочны** твор.
- Характэрнымі яго рысамі з’яўляюцца **гратэскнасць і супрацьпастаўленне:**

- *станоўчага і адмоўнага,*
- *сумленнага і амаральнага,*
- *старога і новага.*

# “Прамова Мялешкі”

- У творы ідэалізуюцца часы панавання **Жыгімонта Старога**, калі ВКЛ было яшчэ самастойнай дзяржавай, калі з’явіліся першадрукі Ф. Скарыны, “Песня пра зубра” М.Гусоўскага і Першы статут ВКЛ, былі ўзведзены новыя замкі і храмы.
- Іншая справа – часы панавання **Жыгімонта Аўгуста**, пры якім была заключана Люблінская унія і згублены для ВКЛ “Подляше и Волынь”, а таксама **Сігізмунда III Вазы**, “в присутности” якога нібыта ці на самой справе была сказана прамова.

# “Прамова Мялешкі”

- Пісьменнік шырока выкарыстоўвае ***гутарковую мову*** з ўласцівай ёй простанароднай фразеалогіяй, фалькллорнымі ідыёмамі і выразамі.

- Пры ўмове, што твор - сапраўднае смелае выступленне рэальнага Мялешкі, стылізаванае ў моднай манеры барока, то грубаватая мова ў творы - рэакцыя на панаванне ў маўленні шматлікіх ***лацінізмаў*** і ***германізмаў***.

# “Прамова Мялешкі”

**ЦЫТАТЫ:**

- «А Жыгімонта караля, дык няма чаго і за чалавека лічыць, бо Падляшша і Валынь нашыя вытруціў. За ляха сябе лічыў!»
- “Адзін толькі Жыгімонт Першы — салодкая памяць яго! Той немцаў, як сабак, не любіў! А літву і русь нашу ласкава мілаваў! І значна лепей пры ім нашым жылося, хоць і не хадзілі ў дарагіх світах.”
- “Кажучы праўду, не так вінаваты кароль, як тыя радныя баламуты, што пры ім сядзяць ды круцяць. Многа тутака такіх ёсць, што хоць наша костка, аднак сабаччым мясам абрасла і ваніць! Тыя радныя, з іх баламутнямі — нас дзяруць, губяць! З-за іх нашыя пакарыстацца нічым не могуць! Краіну губяць! Валынь з Падляшшам адцяпалі ў нас!”

# “Прамова Мялешкі”

**ЦЫТАТЫ:**

- «І тое, міласцівыя панове, немалая шкода, што ад слугаў-ляхаў маем! Давай яму сукню хвалендышавую, і кармі яго сытна. А службы з іх і не пытай! Толькі шыкоўна апранецца і на высокіх падкоўках да дзевак дыбае.»
- «І тое на свеце дуроцце — гадзіннікі! Мне патрафілася на кірмашы ў Кіеве купіць. Даў за яго тры капейкі грошаў, а як паслаў да Вільні на паправу — дык ажно на пяць коп накруціў заморскі злодзей! Добры наш гадзіннік — певень, бо няхібна апоўначы кукарэкае.»

# “Ліст да Абуховіча”

- аўтарства твора прыпісваецца ***Цыпрыяну Камуняку*** (даследчыкі бачаць у ім моўна-стылёвае падабенства з «Прамовай Мялешкі»).
- з'явіўся як рэакцыя на канкрэтную гістарычную падзею – ***заняцце рускім войскам Смаленска*** 23 верасня 1654 г.
- адрасаваны канкрэтнаму прадстаўніку шляхецкага саслоўя – смаленскаму ваяводзе ***Піліпу Казіміру Абуховічу***.
- пасля капіравання адасланы ў ***Ліпу – маёнтак Абуховічаў*** пад Нясвіжам.

# “Ліст да Абуховіча”

- ваяводзе інкрымінуецца, што ён ***здрадзіў Радзіме***, бяздарна здаўшы Смаленск маскоўскім войскам, і атрымаў за гэта ад праціўніка неверагодны ***хабар,*** які з горада вывозілі на 300 вазах.

- чытач можа мець тут справу са звычайнай ***барочнай гіпербалай***, бо дакументаў пра ўзбагачэнне Абуховіча пасля падзення Смаленска няма.

# “Ліст да Абуховіча”

- ***Піліп Абуховіч*** (маршалак рыцарскага кола з 1648 г., пісар ВКЛ, а з 1653 г. смаленскі ваявода) пададзены як ***адмоўны персанаж, антыгерой***.

На старонках твора паўстае:

- ***як дробная і нікчэмная асоба***;
- ***як надзвычай сквапны чалавек***, які за звон чырвоных залатых здатны на агідны ўчынак.

# “Ліст да Абуховіча”

- Вобраз смаленскага ваяводы Піліпа Абуховіча невядомы аўтар намаляваў ***сатырычнымі сродкамі***.
- Ён шырока выкарыстоўваў народныя трапныя і з'едлівыя ***прыказкі і прымаўкі***:

- «уваляўся, як свіння ў гразь»,
- «сядзіць, як дзяцел у дупле»,
- «а тыя копы (паборы) пастрыгуць не аднаго ў халопы») і інш.

# “Ліст да Абуховіча”

- Пяром аўтара твора кіравалі абражаныя патрыятычныя настроі жыхара ВКЛ, яго ўпэўненасцю ў віне Абуховіча.
- Твор з'явіўся да сейма і да смерці ваяводы.
- У 1658 г., разгледзеўшы справу Абуховіча, сейм прызнаў яго невінаватым у здачы Смаленска.

# “Ліст да Абуховіча”

**ЦЫТАТЫ:**

- “І ведаю я, нудна вашай міласці ў жыцці. Не гневайся, твая міласць, на мяне, што тытулу ваяводскага не ўжыў. Каб напісаў — ваяводу смаленскаму, — то схлусіў бы. Каб напісаў — безваяводскаму, — то вашую міласць угнявіў бы. Хоць няма чаго: калі Смаленск прадалі, то й тытул прадалі!”
- “Лепей, пане Піліпе, сядзець табе было ў Ліпе! А то ўваляўся ў вялікую славу, як свіння ў гразь.”

# “Ліст да Абуховіча”

ЦЫТАТЫ:

- “От, нам за тое, што танна масква сабалі прадавала, усю русь з людзьмі адабрала. Мы як пабачылі густыя сабаліныя каўняры, зараз пазналі, што худа будуць біцца нашыя жаўняры! І што мы, дурныя, у кажухах сем гадоў Смаленска здабывалі, тое вы, мудрыя, у сабалях, за чатырнаццаць тыдняў аддалі!”
- За меншую віну, кажуць людзі, Осціка нябожчыка напалохаў кат у Вільні, аж мяса яго валялася. Толькі за тое, што картачкі пісаў да масквы неасцярожна. А мы і цара ў нагу цалавалі, і грошы пабралі! Але мала нам за тое не будзе!

# “Ліст да Абуховіча”

ЦЫТАТЫ:

- “За меншую віну, кажуць людзі, Осціка нябожчыка напалохаў кат у Вільні, аж мяса яго валялася. Толькі за тое, што картачкі пісаў да Масквы неасцярожна. А мы і цара ў нагу цалавалі, і грошы пабралі! Але мала нам за тое не будзе!”
- “І калі б датуль, ваша міласць, пісарам быў бы, дык чалавекам слыў бы!”
- “Няўжо, пане, ад роду гэта дзеецца? Дзед тваёй міласці, калі генералам быў у Мазыры, то, як я чуў, за малыя грошы вялікую няпраўду прызнаў.”